*Калекцыянерам, і не толькі*

# 100 гадоў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

15 верасня Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовы блок «100 гадоў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі». Памер маркі ў блоку 30 х28 мм. Памер блока 107 х52 мм. Наклад блока 15 тыс. Дызайн Марыны Віткоўскай. У аснове блока – помнік Францыску Скарыну ў Мінску (скульптар Аляксандр Дранец). Аддрукаваны таксама без перфарацыі.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі – галоўная бібліятэка краіны, каардынацыйны і метадычны цэнтр бібліятэк Беларусі, рэспубліканскі інфармацыйны, навукова-даследчы і сацыякультурны цэнтр.

Заснавана ў 1922 годзе як Беларуская дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка. Першапачаткова знаходзілася ў Юбілейным доме па вуліцы Захар'еўскай, затым на Чырвонаармейскай вуліцы. Новы будынак бібліятэкі на праспекце Незалежнасці адчыніў свае дзверы для чытачоў 16 чэрвеня 2006 года. Нацыянальная бібліятэка – гэта не толькі найбагацейшы збор кніг, які налічвае больш за 10 мільёнаў дакументаў, але і шматфункцыянальны цэнтр, дзе аб'ядналіся высокія тэхналогіі, сучасны дызайн і незвычайная архітэктура будынка. Ва ўстанове ўпершыню ў краіне ўсталявана аўтаматызаваная сістэма дастаўкі літаратуры з фондасховішча – тэлеліфт. Тут створаны найбольш спрыяльныя ўмовы для захавання кніг і абслугоўвання карыстальнікаў.

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне на паштамце Мінска праводзілася спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

***Выказваем удзячнасць за дапамогу ў падрыхтоўцы рубрыкі выдавецкаму цэнтру «Марка» РУП паштовай сувязі «Белпошта».***

